УДК 069:725.945(476)

# МАСТАЦКА-МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ МУЗЕІ Ў СТРУКТУРЫ МУЗЕЙНАЙ СЕТКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***І. І. Бамбешка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** На падставе пэўнай колькасці крыніц, аналізу музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь, інтэрв'юіравання музейных супрацоўнікаў былі вылучаны мастацка-мемарыяльныя музеі, якія арганізаваны з мэтай ушанавання памяці, дакументавання жыццёвага і творчага шляху як прафесійных, так і самадзейных беларускіх мастакоў і скульптараў. У артыкуле аналізуецца працэс іх стварэння, прыводзяцца класіфікацыйныя і тыпалагічныя асаблівасці, а таксама месца ў музейнай сетцы краіны.

**Ключавыя словы:** Рэспубліка Беларусь, музейная сетка, мастацкія музеі, мастацка-мемарыяльныя музеі, прафесійныя мастакі, музей-майстэрня, самадзейныя мастакі, скульптары.

# ART MEMORIAL MUSEUMS IN THE STRUCTURE OF THE MUSEUM NETWORK OF THE REPUBLIC OF BELARUS

***I. Bambeshka,***
*PhD in Culturology, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** Based on a certain number of sources, an analysis of the museum network of the Republic of Belarus, and interviews with museum employees, art memorial museums were identified, which are organized to honor the memory, document the life and creative path of both professional and amateur Belarusian artists and sculptors. The article analyzes the process of their creation, provides classification and

typological features, as well as their place in the country's museum network.

**Keywords:** Republic of Belarus, museum network, art museums, art and memorial museums, professional and self-made artists and sculptors.

Музейная сетка Рэспублікі Беларусь складаецца з мноства музеяў, якія падпарадкоўваюцца розным дзяржаўным, грамадскім і прыватным структурам. Значнае месца ў ёй займаюць музеі сістэмы Міністэрства культуры, у структуры якога функцыянуе (даныя на канец 2024 г.) 156 музеяў, 11 (7%) з якіх – мастацкія музеі [7, с. 148]. Па складзе збораў сярод мастацкіх музеяў рэспублікі можна вылучыць музеі выяўленчага мастацтва, музеі народнага мастацтва, манаграфічныя музеі, прысвечаныя выдатным жывапісцам, скульптарам, графікам Беларусі і блізкага замежжа, як прафесійным, так і самадзейным. Так, музейнымі сродкамі былі ўшанаваны імёны Н. Орды, І. Я. Рэпіна, М. Шагала, Я. Я. Майсеенкі, В. К. Бялыніцкага-Бірулі, М. А. Савіцкага, З. І. Азгура, В. А. Грамыкі, Г. Х. Вашчанкі, У. І. Стэльмашонка, Л. Д. Шчамялёва, П. В. Масленікава, І. Я. Міско, а таксама іншых вядомых дзеячаў мастацтва, такіх як С. С. Шаўроў, М. М. Пушкар, А. В. Кузьміч, У. А. Мінейка, Г. М. Пранішнікаў, А. А. Ісачоў, У. І. Пракапцоў, Л. М. Дробаў, Б. У. Аракчэеў, М. К. Сеўрук, У. С. Садзін і Я. Н. Драздовіч. Аднак з ліку манаграфічных мастацкіх музеяў далёка не ўсе з'яўляюцца мемарыяльнымі. Вызначэнне мемарыяльных музеяў прадстаўлена ў «Словаре музейных терминов» (2010) [8]. Да мастацка-мемарыяльных адносяцца: Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна [8; 11], Музей-майстэрня мастака-кераміста М. М. Пушкара [2], Музей драўлянай скульптуры рэзчыка С. С. Шаўрова [6], Кватэра-музей М. К. Сеўрука [12], Дом-музей М. Шагала [1], Мемарыяльны музей-майстэрня З. І. Азгура [3; 9], Сядзібны дом Н. Орды [10] і Майстэрня-музей Івана Міско [4].

Першым з пералічаных музеяў быў створаны Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна. Першыя спробы захавання сядзібы мастака датуюцца 1920-і гг. і звязаны з дзейнасцю самога мастака, які звяртаўся ў розныя дзяржаўныя структуры з просьбай узяць пад ахову і яго сядзібу, і мастацкія творы, якія там яшчэ заставаліся. Гэтая актыўнасць майстра на некаторы час зберагла сядзібу ад спусташэння. Пэўны час у Здраўнёва (з лета 1918 г.

да 1930 г.) жыла малодшая дачка мастака Т. І. Рэпіна. Пасля атрымання дазволу выехаць у Фінлядыю яна прадала дом сялянам на дровы. У наступныя дзесяцігоддзі лёс рэпінскай спадчыны ў Беларусі неаднаразова хваляваў айчынных і расійскіх дзеячаў культуры, аднак рэальных крокаў не прадпрымалася. Сітуацыя пачала мяняцца толькі ў 1970 г., калі на пасяджэнні бюро Віцебскага абласнога камітэта КПБ было прынята рашэнне аб аднаўленні дачы І. Я. Рэпіна і ўключэнні яе ў структуру Віцебскага абласнога краязнаўчага музея ў якасці філіяла. Асноўныя работы па аднаўленні будынка, малых архітэктурных форм, добраўпарадкаванні сядзібы завяршыліся ў 1988 г. 11 жніўня 1988 г. выйшаў загад Міністэрства культуры БССР аб стварэнні Музея І. Я. Рэпіна «Здраўнёва». Аднак музей не змог цалкам пачаць працу, паколькі пажар 1995 г. знішчыў другі паверх і вежу. Таму аднаўленчая праца працягнулася, сядзіба была адкрыта толькі ў 2000 г. [11]. На сённяшні дзень сядзіба ўяўляе сабой музейны комплекс, які складаецца з адноўленага галоўнага сядзібнага дома, дома кіраўніка са службовымі памяшканнямі і выставачнай залай, адрэстаўраванага склепа. На тэрыторыі сядзібы захавалася мемарыяльная ліпавая алея, дзе растуць дрэвы, пасаджаныя самім мастаком. У сядзібным доме размяшчаецца мемарыяльная экспазіцыя.

Наступным па часе стварэння з’яўляецца Музей-майстэрня мастака-кераміста М. М. Пушкара. М. М. Пушкар быў родам з Белгародскай вобласці, аднак у 1966 г. жыццё яго прывяло ў Беларускае Палессе, у Мазыр, дзе ён працаваў на Заводзе меліярацыйных машын, затым на мясцовай фабрыцы мастацкіх вырабаў, а ў вольны час ляпіў з гліны вобразы беларусаў-палешукоў. Паступова яго працы набылі вядомасць, у яго работ з’явіліся прыхільнікі і паслядоўнікі. Праз пэўны час М. М. Пушкар стаў членам саюза мастакоў. У 1978 г. гарадскія ўлады выдзелілі майстру месца для майстэрні – стары закінуты дом, які мастак прывёў у парадак, арганізаваў там майстэрню, а затым і музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на грамадскіх пачатках. 25 жніўня 1988 г. пастановай калегіі Міністэрства культуры БССР музею было прысвоена званне «народны» [2, с. 33; 5]. У 1991 г., яшчэ пры жыцці майстра, Музей-майстэрня ўвайшоў у склад Мазырскага краязнаўчага музея. У музеі не толькі прадстаўлены працы М. М. Пушкара, да-

кументы аб яго жыцці і творчасці, але і захоўваецца традыцыя вырабу гліняных фігурак.

Падобны лёс і ў спадчыны самадзейнага майстра-разьбяра па дрэве С. С. Шаўрова, які падарыў свой дом у Оршы разам з уласнымі працамі гораду. Для захавання спадчыны мастака 8 снежня 1989 г. было прынята рашэнне аб стварэнні музея твораў аршанскага самародка. На працягу трох гадоў у доме разьбяра вялася праца над экспазіцыяй, якая б прадстаўляла яго жыццё і творчасць. На тэрыторыі сядзібы таксама былі ўстаноўлены шматмятровыя драўляныя скульптуры, пабудавана майстэрня з кабінетамі, дзе разьбяр працягваў ствараць вобразы і перадаваць майстэрства сваім вучням на занятках адпаведнага гуртка. У 1992 г. Музей драўлянай скульптуры разьбяра С. С. Шаўрова адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў [6].

Наступны вопыт стварэння мастацка-мемарыяльнага музея звязаны з ушанаваннем творчай спадчыны айчыннага мастака-жывапісца, графіка, ілюстратара М. К. Сеўрука. 9 ліпеня 1996 г. у Нясвіжы, у доме, дзе майстар жыў і працаваў на працягу 40 гадоў, была адкрыта музей-кватэра. Першапачаткова экспазіцыя займала адзін невялікі пакой. У 2012 г. сітуацыя змянілася, плошча музея павялічылася і была створана новая экспазіцыя. Напярэдадні адкрыцця апошняй была праведзена вялікая работа па вывучэнні дакументаў, аналізе музейнай калекцыі «М. К. Сеўрук» і яе папаўненні выяўленчымі работамі майстра, яго асабістымі рэчамі. Створаная экспазіцыя прадстаўляе два перыяды творчасці мастака – віленскі (1927–1939) і нясвіжскі (1939–1979). Дадаткова ў ёй вылучаюцца два раздзелы: «Творчая спадчына» і «Біяграфічна-мемарыяльны» [12]. Музей-кватэра М. К. Сеўрука з’яўляецца філіялам Нясвіжскага гісторыка-краязнаўчага музея.

Адным з найбольш вядомых савецкіх і беларускіх скульптараў можна назваць З. І. Азгура. Разумеючы значнасць асобы майстра, яго творчасці для беларускай культуры і мастацтва, яго сям’я пасля смерці скульптара ў 1995 г. перадала дом-майстэрню дзяржаве для арганізацыі мемарыяльнага музея. 4 студзеня 1996 г. быў падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб увекавечанні памяці народнага мастака СССР, Героя Сацыялістычнай Працы З. І. Азгура». Створаны Мемарыяльны музей-майстэрня З. І. Азгура 18 лютага 2000 г. быў адкрыты для наведвальнікаў. Збор музея, уключаючы скульптуру, жывапіс, графіку, архіў, асабістую бібліятэку і асабістыя рэчы, агульнай

колькасцю больш за 4000 прадметаў асноўнага фонду, дазваляе шырока прадставіць жыццё і творчасць выдатнага скульптара [3; 9]. У пачатку 2025 г. Мемарыяльны музей-майстэрня З. І. Азгура стаў філіялам Музея гісторыі горада Мінска (МГГМ).

Адной са значных падзей у культурным жыцці рэспублікі 1990-х гг. стала адкрыццё Музея Марка Шагала. У пачатку 1990-х гг. у Віцебску быў створаны грамадскі Шагалаўскі камітэт, які сваю галоўную задачу бачыў у адкрыцці ў горадзе музея мастака, што амаль трэць свайго жыцця пражыў у Віцебску. Дзейнасць камітэта была дастаткова паспяховай, паколькі 23 кастрычніка 1991 г. было прынята рашэнне Віцебскага гарвыканкама аб стварэнні музея [1].

Музей займае два будынкі: Арт-цэнтр Марка Шагала і Дом-музей Марка Шагала. Апошні, адкрыты ў 1997 г., носіць мемарыяльны характар і размяшчаецца ў доме, які ў пачатку XX ст. пабудаваў бацька мастака, дзе М. Шагал правёў свае юнацкія гады. У экспазіцыі прадстаўлены прадметы побыту XIX–XX стст., копіі архіўных дакументаў і работ мастака, якія расказваюць пра гады жыцця Марка Шагала і яго сям'і ў Віцебску.

З 2011 г. у структуры МГГМ функцыянуе яшчэ адзін мемарыяльны музей – Майстэрня-музей Івана Міско. Музей размяшчаецца ў гістарычным цэнтры Мінска, у будынку XIX ст., у якім на працягу ўжо амаль паўстагоддзя працуе выдатны беларускі скульптар. У музеі прадстаўлена больш за сотню твораў скульптара, вялікая колькасць фатаграфій, інструментаў мастака. Акрамя скульптур, можна ўбачыць фотапартрэты і графічныя малюнкі [4].

І апошні па часе стварэння і адкрыцця мастацка-мемарыяльны музей прысвечаны жыццю і творчасці теленавітага кампазітара, педагога і мастака Напалеона Орды. У лістападзе 2021 г. ва ўрочышчы Чырвоны двор недалёка ад в. Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці быў адкрыты Сядзібны дом Напалеона Орды, які стаў часткай Раённага музейнага комплексу імя Н. Орды. Тут, у гэтым доме, Н. Орда нарадзіўся ў 1807 г. і пражыў больш за 20 гадоў. Затым сядзіба неаднаразова мяняла ўладальнікаў, а ў 1943 г. была спалена і пасля не аднаўлялася. У 2004 г. былі праведзены раскопкі з мэтай вызначэння дакладнага месцазнаходжання дома, яго памераў, унутранай планіроўкі і архітэктурных асаблівасцей. На працягу 5 гадоў вяліся аднаўленча-рэстаўрацыйныя работы [10]. Сёння радавое гняздо Н. Орды выглядае так, якім яно было ў першай палове

XIX ст. У маёнтку можна ўбачыць рабочы кабінет і майстэрню мастака, пакоі яго маці і пляменніцы, партрэтную з выявамі сям'і, гасціную, буфетную і сталовую.

Такім чынам, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у 1990–2020-х гг. было створана 8 мастацка-мемарыяльных музеяў, якія музеефіцыруюць асобу і творчасць зусім розных па мастацкай манеры майстроў. Многія з іх уяўляюць сабой адноўленую сядзібу, напоўненую копіямі, рэпрадукцыямі, але памяць месца, дзе захаваўся ландшафт, дазваляе адчуваць прысутнасць майстра. У шэрагу выпадкаў адбывалася музеефікацыя, якая дазволіла максімальна захаваць і атмасферу, і прадметы, і творчую спадчыну. Ёсць у гэтым пераліку і па-сапраўднаму «жывыя» музеі, дзе наведвальнікі з'яўляюцца сведкамі фарміравання творчай спадчыны майстра. Усе названыя музеі з'яўляюцца філіяламі больш буйных музеяў і ўяўляюць сабою музеі ансамблевага тыпу, паколькі ў аснове іх дзейнасці ляжаць захаваныя ці адноўленыя мемарыяльныя будынкі з іх інтэр'ерамі і прылеглай тэрыторыяй: музеі-сядзібы, музеі-кватэры, дамы-музеі і музеі-майстэрні.

*1.* Арт-центр Марка Шагала // Централизованная библиотечная система города Витебска. – URL: https://cbsvit.by/index.php/2012-05-10-07-15-06/gorodskie-istorii/4274-art-tsentr-marka-shagalau (дата обращения: 01.12.2024).

*2. Белевич, А. В.* Вклад Николая Пушкаря в развитие декоративно-прикладного творчества Припятского Полесья / А. В. Белевич, З. С. Варнава // Мозырщина: люди, события, время : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Мозырь, 27 мая 2022 г. / редкол.: Т. Н. Сыманович, М. М. Щербин, Е. Е. Барсук. – Мозырь, 2022. – С. 30–34.

*3.* Государственное учреждение «Мемориальный музей-мастерская З. И. Азгура». – URL: http://azgur.museum.by/ (дата обращения: 01.12.2024).

*4.* Мастерская-музей Ивана Миско // Belarus.travel. – URL: https://ru.belarus.travel/landmarks/masterskaia-muzei-ivana-misko (дата обращения: 03.12.2024).

*5. Медведева, Е.* Николай Никитович Пушкарь: его руки просили глины… / Е. Медведева // Жыццё Палесся. – URL: https://web.archive.org/web/20190224202016/http://www.mazyr.by/2014/01/nikolaj-nikitovich-pushkar-ego-ruki-prosili-gliny/ (дата обращения: 03.12.2024).

*6. Нирман, Н.* Музею Семёна Шаврова исполнилось 30 лет / Н. Нирман // Аршанская газета. – URL: https://www.belstat.gov.by/upload-

belstat/upload-belstat-pdf/oficial_statistika/2024/fixed_investment-2408.pdf (дата обращения: 03.12.2024).

*7.* Республика Беларусь 2024 : статистические данные о социально-экономическом положении Республики Беларусь в 2023 г. / / М-во статистики и анализа Республики Беларусь ; редкол.: И. В. Медведева (пред.) [и др.]. – Минск : Нац. статист. комитет Респ. Беларусь, 2024. – 317 с.

*8.* Словарь музейных терминов : сб. науч. трудов / М-во культуры Рос. Федерации, Гос. центр. музей современной истории России. – 2-е изд., перераб., доп. и испр. – М. : ГЦМСИР, 2010. – Вып. 31. – 229 с.

*9.* Сокровищница творчеств // Мемориальный музей-мастерская З. И. Азгура. – URL: https://azgur.by/kollekcii/ (дата обращения: 01.12.2024).

*10.* Усадебное имение Н. Орды в урочище Красный двор // Іванаўская цэнтр. раён. бібліятэка імя Ф. І. Панфёрова. – URL: https://www.janowlib.by/index.php/kraevedenie/ivanovskij-rajon/labirint-vremeni/1648-usadebnoe-imenie-n-ordy-v-urochishche-krasnyj-dvor (дата обращения: 25.11.2024).

*11. Шишанов, В.* Здравнёво. Исторический облик и музеефикация усадьбы / В. Шишанов // Матэрыялы II Міжнар. канф. па праблемах музеефікацыі ўнікальных гістарычных тэрыторый, Полацк, 14–16 кастр. 1996 г. / уклад. Т. Джумантаева. – Полацк, 1996. – С. 38–44.

*12. Шчарбачэвіч, Н.* Таямніцы жыцця мастака Міхася Сеўрука адкрываюцца ў кватэры-музеі ў Нясвіжы / Н. Шчарбачэвіч // Звязда. – URL: https://zviazda.by/be/news/20150714/1436829065-tayamnicy-zhyccya-mastaka-mihasya-seuruka-adkryvayucca-u-kvatery-muzei-u (дата звароту: 17.07.2015).